www.Belarus-Live.eu

BELARUS Live

NEWSLETTER
27/03-03/04/08

АФІЦЫЙНА
▪Генэрал-лейтэнант Сяргей Гурулёў прымаў удзел у 7-й выставе сілаў спэцыяльных апэрацыяў "SOFEX-2008"

ПАЛІТЫКА
▪МЗС Беларусі абражанае на Польшчу з-за “Карты паляка”

АПАЗЫЦЫЯ
▪Суд над Андрэем Кімам

ГРАМАДЗТВА
▪Кампанія 193.1 – за свабоду асацыяцый у Беларусі

ЭКАНОМІКА
▪Кошт на расейскі газ да канца году значна не павысіцца

КУЛЬТУРА
▪“Менская вясна – 2008”

ЗДАРЭНЬНІ
▪Бандыты намалявалі серп і молат

Чарговы тыдзень запар сярод топ-навінаў зь Беларусі фігуруюць адносіны з Вашынгтонам. 2 красавіка намесьнік міністра замежных справаў Беларусі Віктар Гайсёнак заявіў журналістам, што Беларусь скарачае колькасьць супрацоўнікаў сваёй амбасады ў Вашынгтоне да сямі чалавек і чакае ад амэрыканскага боку аналягічных крокаў у дачыненьні да сваёй дыпмісіі ў Менску. Пасьля папярэдняга вымушанага скарачэньня, у цяперашні час, у амэрыканскай дыпмісіі працягваюць працаваць 17 супрацоўнікаў.

Адміністрацыя Джорджа Буша лічыць «неапраўданай і неабгрунтаванай» прапанову Менску зноў скараціць колькасьць пэрсаналу амбасады ЗША ў Беларусі. Паводле прадстаўніка замежнапалітычнага ведамства ЗША, амэрыканскія ўлады ў цяперашні час «разглядаюць варыянты дзеяньняў у адказ». Ён пацьвердзіў, што ў ЗША зараз няма намераў скасаваць санкцыі ў адносінах да канцэрну «Белнафтахім», якія і справакавалі цяперашні крызіс у двухбаковых адносінах. Варта таксама нагадаць пра заяву памочніка дзяржсакратара ЗША Дэвіда Крэмэра, якую ён зрабіў яшчэ пасьля першага патрабаваньня беларускага МЗС скараціць колькасьць амэрыканскіх дыпляматаў у Менску. Ён, у прыватнасьці, зазначыў, што цярпеньне Вашынгтону ў адносінах да дзеяньняў Менску «мае мяжу». Але, мабыць, кіраўнік Беларусі вырашыў правесьці сур’ёзныя выпрабаваньні адносінаў з ЗША. І, як мяркуюць назіральнікі, толькі з-за вядомых яму самому меркаваньняў.

Адным з наступстваў шалёнага антыамэрыканізму, які сёньня дэманструе рэжым Лукашэнкі, стала рашэньне НАТА наконт абмежаваньня ўзроўню ўдзелу беларускай дэлегацыі краіны-партнэра ў Бухарэсцкім саміце Рады Эўраатлянтычнага партнэрства (РЭАП). "МЗС Беларусі лічыць рашэньне НАТА пра абмежаваньне ўзроўню ўдзелу дэлегацыі краіны-партнэра ў саміце РЭАП непрымальным. У сувязі з гэтым Беларусь паводле прынцыповых меркаваньняў вымушаная адмовіцца ад удзелу ў Бухарэсцкім саміце РЭАП", – гаворыцца ў заяве беларускага замежнапалітычнага ведамства. Каб зразумець глыбіню самаізаляцыі, у якой аказаўся беларускі рэжым, можна зазначыць, што Беларусь стала адзінай ня толькі ў Эўропе, але і сярод астатніх чальцоў натаўскай праграмы «Партнэрства дзеля міру» краінай, афіцыйныя прадстаўнікі якой адсутнічалі 2–4 красавіка ў Бухарэсьце.

З куды большай трывогай у Менску чакаюць магчымых дзеяньняў Эўразьвязу, якія могуць дапоўніць амэрыканскія санкцыі. Пра такую магчымасьць заявіў эўрадэпутат Яцэк

Пратасевіч. Праўда, ступень рэальнага ўплыву рэзалюцыяў Эўрапарлямэнту на прыняцьце канкрэтных рашэньняў Эўракамісіі ня варта перабольшваць. Але і перамяншаць было б памылкай. Паводле некаторых дадзеных, 7 красавіка павінна быць абвешчана пра ўвядзеньне новых санкцыяў Эўразьвязу ў адносінах да Беларусі. Паводле інфармацыі выданьня «Наша Ніва», атрыманай з дыпляматычных крыніцаў, пакуль не вядома, супраць каго будуць накіраваныя гэтыя санкцыі. Таксама малаімаверна, што гэта будуць санкцыі эканамічнага характару. Чакаецца, што гэта будуць, як і раней, сымбалічныя крокі.

На брыфінгу, які прайшоў 3 красавіка ў Менску, афіцыйны прадстаўнік міністэрства замежных справаў Беларусі Андрэй Папоў адмовіўся ад разважаньняў наконт магчымага далучэньня Эўразьвязу да санкцыяў ЗША ў адносінах да Беларусі, заявіўшы, што «гэтае пытаньне неабходна адрасаваць непасрэдна краінам – эўрапейскім партнэрам». Пры гэтым прэс-сакратар МЗС па сутнасьці пацьвердзіў, што Беларусь намераная ўцягнуць Расею ў беларуска-амэрыканскі скандал. Ён нагадаў, што Беларусь і Расея абавязаліся ўзгадняць свае дзеяньні ў галіне замежнай палітыкі.

«У рамках дадзенага інструмэнту ёсьць абсалютна легітымная і законная магчымасьць для абмеркаваньня з Расеяй і праблемы ўвядзеньня ЗША санкцыяў у дачыненьні да Беларусі», – заявіў Папоў. Варта зазначыць, што Крэмль пакуль захоўвае маўчаньне наконт беларуска-амэрыканскага скандалу, устрымліваючыся ад публічных заяваў у падтрымку беларускага рэжыму. А на зробленую ў Менску заяву расейскага прэм’ера Віктара Зубкова пра тое, што амэрыканскія санкцыі ў дачыненьні да канцэрну «Белнафтахім» зьяўляюцца «палітызаванымі», ніхто толкам, акрамя дзяржаўных СМІ Беларусі, не зьвярнуў увагі. Фактычнае маўчаньне Крамля наконт дадзенага дыпляматычнага скандалу ўспрымаюць у Менску як кепскі для сябе знак. Адназначнай падтрымкі паводзінаў Лукашэнкі не адчуваецца.

Кепскім знакам для афіцыйнага Менску стала і паведамленьне пра тое, што нямецкі Фонд імя Фрыдрыха Эбэрта вымушаны распачаць працэс закрыцьця свайго прадстаўніцтва ў Беларусі.

У 2007 годзе Фонд імя Фрыдрыха Эбэрта ў значнай меры ўдзельнічаў у арганізацыі Дыспутаў памяці Ёханэса Рау ў Менску, далейшы ўдзел у правядзеньні якіх плянаваўся Фондам імя Фрыдрыха Эбэрта і ў 2008 годзе. З гэтай мэтай фонд запрашаў таксама вядучых нямецкіх палітыкаў у Менск, сярод іх – прэм’ер-міністра зямлі Брандэнбург Матыяса Плацэка. Тое, што ў дадзены момант прадстаўніцтва фонду знаходзіцца ў працэсе закрыцьця, ягоны кіраўнік Штэфан Хробат разглядае як прыкры для Беларусі факт, паколькі адзіны прадстаўлены ў Беларусі палітычны фонд менавіта ў апошнія месяцы запрапанаваў новыя ідэі і канцэпцыі дыялёгу і супрацоўніцтва паміж Нямеччынай, Эўропай, Украінай і Беларусьсю. Аднак зьмененыя ўмовы ў Беларусі і крокі афіцыйнага боку прывялі да таго, што закрыцьцё прадстаўніцтва стала непазьбежным. Як і непазьбежнае рынкавае стаўленьне Крамля да свайго беларускага стратэгічнага хаўрусьніка. Надзеі Лукашэнкі на тое, што яму ўсё ж удасца перагледзець на сваю карысьць існуючую формулу кошту на газ, не апраўдваюцца. Дасланая ім днямі дэлегацыя ў Маскву, пасьля размоваў у «Газпраме» ды іншых калідорах расейскай улады, вярнулася дадому бяз вынікаў. Дынаміка росту цаны на газ захаваецца. Паводле некаторых дадзеных, да канца бягучага году цана для Беларусі можа скласьці 200 даляраў. Як кажуць многія экспэрты і эканамісты, для эканамічнага дабрабыту кіроўнага рэжыму ў Беларусі гэта можа стаць катастрофай.

## АФІЦЫЙНА

### Генэрал-лейтэнант Сяргей Гурулёў прымаў удзел у 7-й выставе сілаў спэцыяльных апэрацыяў "SOFEX-2008"

**З 31 сакавіка па 1 красавіка 2008 г. начальнік Генэральнага штабу Ўзброеных Сілаў, першы намесьнік міністра абароны Рэспублікі Беларусь генэрал-лейтэнант Сяргей Гурулёў прымаў удзел у 7-й выставе сілаў спэцыяльных апэрацыяў "SOFEX-2008", якая праводзіцца ў Амане (Ярданскае Хашыміцкае Каралеўства) пад патранажам караля Ярданії і ў дадзеным рэгіёне зьяўляецца найбуйнейшай у сваёй галіне.**

У ходзе выставы Сяргей Гурулёў сустрэўся са старшынём аб'яднанага камітэту начальнікаў штабоў Узброеных Сілаў Ярданії корпусным генэралам Халідам Дж. Аль-Сарая, а таксама з кіраўнікамі ваенных дэлегацый іншых дзяржаў рэгіёну.

*Mod.mil.by*

## ПАЛІТЫКА

### МЗС Беларусі абражанае на Польшчу з-за “Карты паляка”

**У адказ на крок польскага ўраду Беларусь абяцае распачаць аналягічную ініцыятыву.**

З заклапочанасьцю й зьдзіўленьнем Менск успрыняў інфармацыю пра тое, што польскія дыппрадстаўніцтвы ў Беларусі распачалі прыём дакумэнтаў на “Карту паляка”.

Прэс-сакратар МЗС Андрэй Папоў заявіў, што польскі бок прыняў гэты закон насуперак міжнароднаму праву й практыцы, а таксама без папярэдніх кансультацыяў зь Менскам.

Нагадаем, што Беларусь прапанавала Польшчы ўвесьці мараторый на выдачу “Карт паляка”, а таксама зьвярнуцца па ацэнку ў Вэнэцыянскую камісію Рады Эўропы.

Прэс-служба МЗС падкрэсьлівае, што польскі бок праігнараваў намаганьні Менску вырашыць пытаньне неканфрантацыйным шляхам. Між тым Папоў зазначыў, што беларускі ўрад чакае сыгналу з Польшчы дзеля вырашэньня праблемы. У адваротным выпадку Менск пакідае за сабой права зрабіць адпаведныя крокі.

## АПАЗЫЦЫЯ

### Суд над Андрэем Кімам

**Сёньня пачнецца суд над моладзевым актывістам і праваабаронцам Андрэем Кімам. Ён быў затрыманы падчас акцыі прадпрымальнікаў 21 студзеня й арыштаваны на 10 сутак.**

Пасьля гэтага Кіма перавялі ў ізалятар часовага ўтрыманьня. Супраць яго ўзбуджаная крымінальная справа паводле артыкулу 364 „гвалт у дачыненьні да супрацоўніка міліцыі ў мэтах перашкодзіць выконваньню службовых абавязкаў”.

## ГРАМАДЗТВА

### Кампанія 193.1 – за свабоду асацыяцый у Беларусі

**У Швэцыі пачалася міжнародная акцыя „Кампанія 193.1 – за свабоду асацыяцый у Беларусі”, паведамляе „Вясна 96”. Кампанію арганізавалі дэмакратычная арганізацыя „Швэдзкая ініцыятыва па правах чалавека” й беларускі праваабаронца Алесь Бяляцкі.**



*Фота Юліі Дарашкевіч*

Ініцыятары кампаніі паставілі мэту зьвярнуць увагу швэдзкай грамадзкасьці й палітыкаў на абмежаваньне свабоды асацыяцыяў у Беларусі й спробах недапушчэньня гэтых абмежаваньняў. „Швэдзкая ініцыятыва па правах чалавека” таксама хоча маральна й матэрыяльна падтрымаць беларускія арганізацыі, якія пацярпелі ў выніку дзейнасьці ўладаў.

„Кампанія 193.1” накіраваная супраць згаданага артыкулу ў Крымінальным кодэксе Беларусі. Ён прадугледжвае адказнасьць за „незаконную арганізацыю дзейнасьці грамадзкага аб’яднаньня, рэлігійнай арганізацыі ці фонду, альбо ўдзел у іх дзейнасьці”.

## ЭКАНОМІКА

### Кошт на расейскі газ да канца году значна не павысіцца

**Кошт тысячы кубамэтраў расейскага газу для Беларусі да канца 2008 году зьменіцца неістотна. Пра гэта сёньня паведаміў амбасадар Расейскай Фэдэрацыі ў Менску Аляксандар Сурыкаў.**

Расейскі дыплямат заявіў, што цана можа павысіцца максымальна на 7%, то бок са 119 даляраў да 128. Пры гэтым Сурыкаў абвергнуў заявы намесьніка дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Васіля Хрола аб тым, што ў наступным годзе цана за 1 тыс. кубамэтраў складзе 200 даляраў.

“Хрол можа казаць усё што заўгодна”, – адказаў амбасадар. Паводле яговых словаў, згодна з падпісанай дамовай, у 2009 годзе кошт расейскага газу для Менску не перакрочыць 80% ад эўрапейскай цаны.

## КУЛЬТУРА

### “Менская вясна – 2008”

**У сталіцы адкрыўся міжнародны фэстываль музыкі.**

26-я па ліку “Менская вясна” сёлета будзе прысьвечаная 70-годзьдзю Белдзяржфілармоніі. Да канца месяца ў рамках імпрэзы адбудзецца 29 канцэртаў, у іх прымуць удзел музыканты з 14 краінаў сьвету.

У залях Белдзяржфілармоніі выступяць народная артыстка Расеі, скрыпачка Ліяна Ісакадзэ, заснавальнік Летувіскага сымфанічнага аркестру, адзін з найбольш вядомых дырыжораў сьвету Гінтарас Рынкявічус, а таксама джазавыя выканаўцы з Польшчы.

Адкрылася “Менская вясна” 3 красавіка канцэртам з цыклу “Шэдэўры сусьветнага арганнага мастацтва”. 10 красавіка адбудзецца творчы вечар паэткі Бэлы Ахмадулінай, а на Вялікдзень у Малой зале з канцэртам харавой музыкі выступіць калектыў са Славэніі.

## ЗДАРЭНЬНІ

### Бандыты намалявалі серп і молат

**Невядомыя напалі на сядзібу Партыі БНФ, якая месьціцца па праспэкце Машэрава, 8 у Менску. На галоўным уваходзе чорнай фарбай напісана НБП (нацыянал-бальшавіцкая партыя), намаляваны серп і молат, разьбітыя два вокны.**




*Фота Svaboda.org*

Вандалы кідалі кавалкамі асфальту, які хутчэй за ўсё прывезьлі з сабою. Не пашанцавала й офісу, які месьціцца побач, там таксама разьбілі вокны. Мабыць, палічылі, што й там знаходзіцца Ўправа БНФ. На думку старшыні партыі Лявона

Баршчэўскага, гэта правакацыя спэцслужбаў.

Л.Баршчэўскі: Ня думаю, каб рабіла гэта з Масквы нацыянал-бальшавіцкая партыя. Яна ніколі не заяўляла, што ў яе ёсьць філія ў Беларусі. А міліцыя прыехала толькі таму, што яны разьбілі таксама побач вокны, там ЖЭСаўскае памяшканьне. І толькі дзякуючы гэтаму міліцыя склала пратакол.

Гэта ўжо ня першы напад нацыянал-бальшавікоў на офіс партыі БНФ. Першы здарыўся тры гады таму, а напярэдадні Дня Волі невядомыя зламалі флагштокі, дзе замацоўваліся бел-чырвона-белы й эўразьвязаўскі сьцягі.

---

Belarus live

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

European Radio for Belarus

polishaid

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.

Polonia POLSKIE RADIO